# ПРАВАВАЯ КАНЦЭПЦЫЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ І СТАТУТ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1529 Г.

*І.У. Вішнеўская*

У гістарыяграфіі палітыка-прававой думкі Беларусі XVI ст. імя рэнесансавага мысліцеля Францыска Скарыны часам звязваюць з падрыхтоўкай Статута 1529 г. Гэтай версіі прытрымліваюцца такія беларускія даследчыкі яго творчасці як І. Юхо, Ю. Лабынцаў, У. Конан і іншыя. Вучоныя адзначаюць, што ў поглядах асветніка і палажэннях Статута можна знайсці шмат агульных рыс.

Асветніцкая дзейнасць Скарыны безумоўна садзейнічала развіццю правасвядомасці ў грамадстве ВКЛ і разам з іншымі фактарамі (сацыяльна-эканамічнымі, палітычнымі, культурнымі, прававымі) падрыхтавала ўмовы для кадыфікацыі мясцовага заканадауства. Як і Ф.Скарына, тагачасны заканадаўца імкнецца ва ўсім кіравацца прынцыпам хрысціянскай справядлівасці (натуральна, у адпаведнасці са сваёй правасвядомасцю), устанаўленнямі хрысціянскага права, пад якім разумеліся крытэрыі справядлівасці, вылучаныя ў Бібліі. Нормы першага Статута замацоўваюць такія прававыя ідэі як роўнасць суб’ектаў перад законам, недатыкальнасць асобы і яе ўласнасці, асабістая адказнасць перад законам і г.д. Супастаўленне некаторых норм Статута з прававымі поглядамі Ф.Скарыны дае падставу даследчыкам мяркаваць аб яго ўдзеле ў падрыхтоўцы праекта першага Статута [1, с.163]. На датычнасць доктара Скарыны да Статута 1529 г. указвае і тое, што паводле сваёй структуры гэты звод законаў адпавядае падыходам да класіфікацыі земскага (дзяржаўнага) права, прапанаванай мысліцелем у 1519 г. у прадмове да “Другога закона” апошняй кнігі “Пяцікніжжа” Маісея.

Скарынінская класіфікацыя права на “прироженое” і “написанае”, якое ў сваю чаргу падзялялася на Боскае, царкоўнае і земскае, адлюстроўвала безумоўны ўплыў натуральна-прававога вучэння антычных мысліцелей. Яны падзялялі права на дадзенае людзям прыродай, якое зыходзіць з разумення справядлівасці – натуральнае права і права пазітыўнае – “закон поліса” у

Сакрата, волеўстаноўленае права ў Арыстоцеля, грамадзянскае права (Гай II Ст.), публічнае (Ульпіан), цывільнае (Павел). Пазітыўнае права зыходзіць з “карыснасці ўсіх, або многіх у пэўнай дзяржаве” [2, с.135].

У той жа час, прававыя ідэі Скарыны, у тым ліку і погляды на класіфікацыю права, звязаны з Біблія́й, у якой на думку мысліцеля “... вси законы и права, ими же люде на земли справаватися имають, написаны суть” [3, с.265]. “Прирожены” закон, згодна з меркаваннем Скарыны “от зачала убо веков, егда сотворил Бог первого человека, написал... в серци его” [3, с.279] і асноватворным прынцыпам гэтага закона з’яўляецца біблейскі пастулат, які ў выкладанні асветніка гучыць так: “то чинити иным всем, что самаму любо ест от иных имети” [3, с.278]. На думку Скарыны, ён павінен быць падставаю для дзеючага пазітыўнага заканадаўства – “закона напісанага”.

Як і антычныя аўтары, Ф. Скарына быў упэўнены ў тым, што закон “прирожены” (натуральнае права) павінен быць асновай закона пісанага. Хутчэй за ўсё, беларускі мысліцель быў знаёмы і з пазіцыяй Фамы Аквінскага аб тым, што “чалавечыя законы” можна лічыць справядлівымі толькі ў тым выпадку, калі яны выцякаюць з “закона вечнага” [2, с.149].

Разам з тым, пад пісаным правам беларускі правазнаўца разумеў не толькі дзяржаўныя законы (“права земскае”), але і “от Бога ест данный” Боскі закон, крыніца якога была Біблія і “правила светых отець па сборех пописаные” (кананічнае права).

Царкоўнае і земскае права аб’ядноўвала тое, што іх крыніцаю з’яўляецца воля чалавека “от людей уставленая”. Згодна з меркаваннем У. Конана, беларускі асветнік, у адпаведнасці з духам эпохі, якая не ведала аддзялення царквы ад дзяржавы, надаваў рэлігійным прадпісанням “некаторы нарматыўны, агульнаадукацыйны характар” [4, с.100]. Асабліва падрабязна спыняецца доктар Скарына на класіфікацыі земскага права, якое “... единый, каждый народ своими старейшими ухвалили суть подле яко жеся им наймней видело быти” [3, с.279]. Пры гэтым Ф. Скарына падкрэслівае, што хаця ў кожнага народа ў пэўны гістарычны перыяд яго развіцця існуюць асобыя

прававыя нормы, якія рэгулююць грамадскія адносіны, агульным для земскага права ўсіх часоў і народаў павінны быць такія рысы  як сумленасць, справядлівасць, карыснасць чалавеку і грамадству, адпаведнасць часу і звычаям краіны, зразумеласць, дакладнасць, не дапушчальнасць двухсэнсоўнага тлумачэння. Класіфікацыя земскага права, прапанаваная Ф.Скарынай, грунтуецца на біблейскіх тэкстах. Першым ён называе “посполитае” (агульнае) права, якое рэгулюе шлюбна-сямейные (“мужа и жены пачтивое случение”), дагаварные (“речи позыченое навращение”) адносіны, а таксама грамадскія адносіны ў сферы злачынства і пакарання (“насилию силою отпрение”). Іншымі словамі нормы “посполитого” права выцякаюць з “прироженого (натуральнага) права” ва ўсіх яго праявах: грамадзянскае, шлюбна-сямейнае, крымінальнае і г.д.

Нормы, регулюючыя “... яко земль чужих мечем достование, градав и мест утвержение, послов без переказы отпущение, миру до часу приреченого выполнение, войны неприятелем своим оповедание” [3, с.280], ён адносіць да права  язычаскага (права “языкоў”-народаў), г.зн. міжнароднага права.

Наступнае па скарынінскай класіфікацыі – права царскае, змест якога Скарына па “ Першай  кнізе царстваў”. Аналіз прыведзенай цытаты дае магчымасць вызначыць такое права як дзяржаўна-адміністратыўнае (“... встановить собе воеводы, о сотники... повинитеся убо всякому созданию человечию господа ради... аще дарю, яко преобладающему, или князем, яко от него посланым... воздатите же всем долги, ему же дань-дань, ему же честь-честь...”) [3, с.280].

У сваей класіфікацыі Ф.Скарына вылучае права ваеннае або “рицерскае”, нормы якога рэгулюць важнейшыя пытанні, звязаныя з камплектаваннем і матэрыяльным забеспячэннем арміі, парадкам размяшчэння вайсковых падраздзеленняў, адказнасць за ваенныя злачынстваы і злачынства супраць мірнага насельніцтва і г.д.

Нарэшце, у самастойныя галіны права мысліцель  выдзяляе “местьскае” (гарадское), марское і купецкае (гандлёвае) права. Такім чынам,

падабенства  класіфікацыі прапанавай Ф. Скарынай з размежаваннем норм права паміж асобнымі галінамі і размяшчэнне іх у пэўнай сістэме ў Статуце 1529 г. – відавочна.

Першы раздзел звода законаў аб’ядноўвае нормы дзяржаўнага права, якія вызначаюць прэрагатывы вялікакняскай улады; другі – утрымлівае нормы ваеннага права; трэці – рэгламентуе асабістыя і саслоўныя правы шляхты; чатвёрты і пяты – нормы шлюбна-сямейнага і апякунскага права; шосты – прысвечаны арганізацыі суда і судоваму працэсу; дзесяты – рэгулюе залогавыя праваадносіны. Астатнія раздзелы рэгламентуюць адказнасць за злачынства супраць асобы і маёмасці шляхты і іншыя злачынныя дзеянні [5].

Такім чынам, першы сістэматызаваны звод пісьмовага права ВКЛ (Статут 1529 г.)  адлюстраваў гуманістычныя ідэі эпохі Адраджэння і часткова ўвасобіў прававыя ідэі Ф. Скарыны, у тым ліку і сістэму класіфікацыі законаў, вылучаную ім першадрукаром і асветнікам у 1519 г.

Літаратура

1. Юхо, Я.А. Кароткі нарыс гістрыі дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапаможнік / Я.А. Юхо. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 270 с.

2. История государственно-правовых учений: Хрестоматия / Авт.-сост. С.В. Липень; под общ. ред. В.В. Лазарева. – М.: Спарк, 2006. – 1071 с.

3. Старажытная беларуская літаратура: зб. / Уклад.: Л.С. Курбека, У.А. Марук; прадм.: У.Г. Кароткага. – Мінск: Юнацтва, 2002. – 509 с.

4. Конон, В.М. Гуманистические истоки Статута Великого княжества Литовского 1529г. / В.М. Конон // Первый литовский Статут 1529 г.: Материалы респ. науч. конф., посвящённой 450-летию Первого Статута, Вильнюс, 1982 г. / Мин-во высшего и среднего спец. образования Литовской ССР; под ред.: С. Лазутка (отв. ред.) [и др.]. – Вильнюс, 1982. – С. 99–102.

5. Статут Великого княжества Литовского 1529г. / Под ред. К.И. Яблонскиса. – Минск: Изд-во Академии наук БССР, 1960. – 252 с.